Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 САКАВІКА 2022 г. СУБОТА № 45 (29667)

«МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ» — 50 8

ДЗЕ СУСТРЭЛІ 2149 ГОД? 12

ПРЫГАЖОСЦЬ, АБАЯЛЬНАСЦЬ І МУДРАСЦЬ

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з цудоўным святам — Днём жанчын.

Мы заўсёды сустракаем доўгачаканую вясну, захапляючыся душэўнай прыгажосцю, прывабнасцю і мудрасцю нашых мілых жанчын. Дзякуючы вашым чулым сэрцам і пяшчотнаму клопату з пакалення ў пакаленне захоўваюцца вера ў святасць мацярынства і моц сямейнага ачага, які вы ахоўваеце.

Ва ўсе часы мір на роднай зямлі, нацыянальны дабрабыт і годнасць беларускага народа трымаліся на жаночым імкненні да стварэння, вашай здольнасці любіць і натхняць нас, мужчын, на гераічныя подзвігі, выхоўваць дзяцей у павазе да Айчыны.

Дзякуй, што, рэалізоўваючы свае таленты і прафесійныя ўменні ў самых розных сферах грамадскай і дзяржаўнай дзейнасці, вы застаяцеся адданымі традыцыйным каштоўнасцям, сем'ям і галоўнаму прызначэнню — прадаўжаць жыццё на Зямлі і рабіць свет лепшым.

Жадаю ўсім вам моцнага здароўя, шчасця, радасці і заўсёды веснавога настрою.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота БелТА.

Разбурэнне стэрэатыпаў

СУЧАСНАЯ НАВУКА ЧАКАЕ ЖАНЧЫН

Там, дзе патрабуюцца нестандартныя падыходы, для іх самае месца

У 1903 годзе Нобелеўскую прэмію па фізіцы (за сумесныя даследаванні радыяцыі) падзялілі адразу тры чалавекі: Анры Бекерэль, П'ер Кюры і Марыя Складоўская-Кюры. Марыя стала першай жанчынай — нобелеўскім лаўрэатам. І яна — адзіны лаўрэат у гісторыі, які атрымаў Нобелеўскую прэмію ў дзвюх розных прыродазнаўчых дысцыплінах. У 1911 годзе за адкрыццё палонію і радыю Марыя Складоўская-Кюры была ўзнагароджана Нобелеўскай прэміяй па хіміі. Яна першы даследчык, які ўкараніў прынцыпы фізікі ў медыцыну, дыягностыку і лячэнне захворванняў. Такое спляценне медыцыны і фізікі прывяло да з'яўлення новай галіны навукі, якую сёння называюць медыцынскай фізікай. За ўсе гады існавання Нобелеўскай прэміі яе атрымалі 943 чалавекі, сярод іх толькі 59 жанчын. У прыродазнаўчых і эканамічных навуках жанчыны-лаўрэаты — увогуле рэдкасць. Часцей за ўсё заслугі жанчын адзначаліся Нобелеўскай прэміяй у літаратуры, медыцыне і прэміяй міру.

СТАР. 7

«НОВАЯ РЭДАКЦЫЯ КАНСТЫТУЦЫІ — ГЭТА НАРОДНЫ ДАКУМЕНТ»

Фота БелТА.

Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Лукашэнкі А. Р. на ўрачыстай цырымоніі падпісання Рашэння рэспубліканскага рэферэндуму

Паважаныя суайчыннікі!

Мы ўпісалі новую старонку ў гісторыі суверэннай Беларусі. 27 лютага 2022 года адбыўся рэспубліканскі рэферэндум.

Абсалютная большасць грамадзян падтрымала прапанаваныя канстытуцыйныя папраўкі. А гэта значыць, што падзея ўвойдзе ў падручнікі як чарговая вяха развіцця суверэннай краіны.

І вельмі сімвалічна, што абноўлены Асноўны Закон уступіць у сілу 15 сакавіка — у Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Народ Беларусі зрабіў свой выбар. Выбар на карысць эвалюцыйных пераўтварэнняў палітычнай сістэмы. Дэмакратычна, згодна з нашымі беларускімі законамі. Народ праявіў мудрасць і нацыянальную сталасць.

Ва ўмовах напружанай міжнароднай абстаноўкі, пагроз нашаму традыцыйнаму ўкладу жыцця мы зрабілі сур'ёзны крок на шляху ўмацавання суверэнітэту краіны. Зрабілі яго, абапіраючыся на ўласны досвед канстытуцыйнага рэфармавання, беручы пад абарону спрадвечныя каштоўнасці, назапашаныя за шматвяковую гісторыю беларускага народа. Народа, які ў пераломныя моманты заўсёды рабіў выбар на карысць міру, стварэння і ўмацавання асноў нашай дзяржаўнасці.

Сведчанне таму — і вынікі папярэдніх рэферэндумаў. З той Канстытуцыяй, якую мы пісалі і ўдасканальвалі на пачатку станаўлення суверэннай Беларусі, мы шмат чаго дасягнулі. Але самае галоўнае — прыняцце цяперашняй Канстытуцыі азначае сабой пабудову ўпершыню ў гісторыі нашага народа суверэннай і незалежнай беларускай дзяржавы.

Дасягнулі нямала на фоне найскладанейшых геапалітычных трансфармацый свету, якія склаліся. Практычна з нуля стварылі збалансаваную і эфектыўную вертыкаль кіравання. З улікам грамадскага запыту сфарміравалі новыя структуры, скасавалі аджылыя інстытуты і не раз аптымізавалі дзяржаўны апарат.

Нам у найкарацейшыя тэрміны ўдалося наладзіць дыпламатычныя і гандлёвыя сувязі, умацаваць абарону Айчыны, якая ва ўмовах беспрэцэдэнтнага знешняга ціску на Беларусь з'яўляецца гарантам спакойнага і бяспечнага жыцця.

Наша краіна стала ініцыятарам і актыўнай удзельніцай еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, АДКБ, іншых міждзяржаўных утварэнняў. Сёння мы на роўных удасканальваем наш саюз з Расіяй, вядзём дыялог з міжнароднымі партнёрамі. Займаем цвёрдую пазіцыю ў пытаннях суверэнітэту і бяспекі.

Інвестарам і айчыннаму бізнесу прапанаваны сумленныя і выгадныя ўмовы вядзення эканамічнай дзейнасці. У краіне створаны і функцыянуе шэраг паркаў з асаблівымі прэферэнцыйнымі рэжымамі. Прадпрымальнікі могуць быць спакойныя за сумленны і адказны перад дзяржавай і народам бізнес.

Інстытут сям'і як каштоўнасць, а таксама дзеці, моладзь, старыя і інваліды знаходзяцца пад асаблівай апекай дзяржавы.

Усё гэта — непарушны падмурак нашай дзяржаўнасці, выбудаваны нашымі рукамі. І тыя нормы, якія эфектыўна працавалі да гэтага часу, засталіся на старонках абноўленага Асноўнага Закона. Мы дапамагалі старым, людзям з абмежаванымі магчымасцямі, шматдзетным. Будзем гэта рабіць заўжды. Няхай яны не клапоцяцца аб тым, што, прыняўшы новую Канстытуцыю, мы адыдзем ад нашай палітыкі ў гэтай частцы.

Але прыйшоў час зазірнуць за гарызонт. Вы ведаеце, кажуць юрысты, што Канстытуцыя — гэта дагавор улады і народа. Сапраўды, гэта дагавор. І ў гэтай Канстытуцыі адлюстраваны асноўныя спадзяванні і жаданні нашага народа. Але скажу шчыра: калі б мы спыніліся на жаданнях і спадзяваннях толькі нашага грамадства і народа, мы ў найлепшым выпадку затармазілі б сваё развіццё, мы не развіваліся б.

Таму любая ўлада на тое і ўлада, на тое называюць яе і элітай грамадства, каб ісці крыху наперадзе народа і паказваць той шлях, па якім гэты самы народ разам з гэтай уладай павінны рухацца. А для гэтага трэба крыху зазірнуць наперад, за гарызонт.

Гісторыя свету вымяраецца перыядамі. І мы своечасова ўлавілі свой момант — момант паслядоўнага пераходу на новы ўзровень развіцця грамадства і нашай палітычнай сістэмы. Тое, якім маштабным, рэзанансным атрымалася ўсенароднае абмеркаванне паправак у Канстытуцыю, пацвярджае гэты тэзіс. Беларусы былі актыўныя, шмат спрачаліся, перажывалі. Словам, абыякавых не было!

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2022 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!